# НА ВАРЦЕ ЗАВАЁЎ САЦЫЯЛІЗМУ І МІРУ

**23 ЛЮТАГА наша краіна адзначае 66-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту — свята, роднае і блізкае кожнаму грамадзяніну нашай Радзімы. Разам з савецкімі людзьмі гэту знамянальную дату святкуюць і народы братніх сацыялістычных краін, усе прагрэсіўныя людзі свету.**

**Сёлетняя гадавіна Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту адзначаецца ў год 40-годдзя бліскучых перамог Савецкіх Узброеных Сіл, дасягнутых у перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў такіх як важнейшых аперацыях, як Беларуская, Яска-Кішынёўская і іншых, у год поўнага разгрому вялікай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск на тэрыторыі Беларусі і вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**Працоўныя нашай краіны разам з воінамі арміі і флоту сустракаюць 66-ю гадавіну Савецкіх Узброеных Сіл у абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага рашэннямі чэрвеньскага і снежаньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, узросшага імкнення дабівацца ўдасканалення развітога сацыялізму, памнажэння эканамічнай і ваеннай магутнасці сацыялістычнай дзяржавы, умацавання дысцыпліны, арганізаванасці і адказнасці на кожным участку работы.**

Суровым баявым хрышчэннем для першых чырвонаармейскіх фарміраванняў з'явіліся жорсткія сутычкі з войскамі імперыялістычнай Германіі ў лютым 1918 года, калі над маладой Савецкай Рэспублікай навісла смяротная пагроза. У адказ на ленінскі заклік у краіне пачалося масавае ўступленне працоўных у рады Чырвонай Арміі. У азнаменаванне пачатку мабілізацыі рэвалюцыйных сіл на адпор ворагу, а таксама першых поспехаў чырвонаармейскіх палкоў у барацьбе з германскімі захопнікамі быў устаноўлены Дзень Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, які 23 лютага адзначаецца як усенароднае свята.

Вялікая Айчынная вайна яшчэ раз пацвердзіла, што подзвіг у імя Радзімы — гэта норма паводзін савецкага чалавека — грамадзяніна сацыялістычнай Айчыны. Яна пераканаўча даказала, што любыя ваенныя авантуры імперыялістаў супраць сацыялізму непазбежна прыводзяць да паражэння агрэсара, што няма ў свеце сіл, якія змаглі б спыніць наступальнае развіццё сацыялістычнага грамадства.

За гады, якія прайшлі пасля Вялікай Айчыннай вайны, наша краіна ператварылася ў магутную дзяржаву свету. Вялікіх поспехаў у сваім развіцці дасягнулі і іншыя краіны сацыялістычнай садружнасці. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад настойліва ажыццяўляюць міралюбівую знешнюю палітыку. Рэакцыйныя сілы ЗША і іх саюзнікі па агрэсіўных блоках узмацняюць гонку ўзбраенняў, настойліва дамагаюцца павелічэння сваёй ваеннай магутнасці.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад уважліва сочаць за падкопамі рэакцыйных сіл, робяць усё для ўмацавання абароннай магутнасці нашай краіны, павышэння баявой гатоўнасці войск і сіл флоту.

Сёння, як і раней, з моманту стварэння Савецкіх Узброеных Сіл, іх прынцыпы будаўніцтва і характар падрыхтоўкі асабовага саставу маюць сваёй мэтай адбіць магчымую агрэсію з боку імперыялістычных краін.

Рэальна ацэньваючы небяспеку ядзернай катастрофы, Савецкая дзяржава разам з іншымі сацыялістычнымі краінамі вядзе актыўную барацьбу за спыненне гонкі ўзбраенняў, памяншэнне пагрозы ядзернай вайны.

Генеральны сакратар ЦК КПСС К. У. Чарненка на пачарговым лютаўскім (1984 г.) Пленуме ЦК КПСС заявіў: «Мы добра бачым пагрозу, якую ствараюць сёння для чалавецтва безразважныя, авантурыстычныя дзеянні агрэсіўных сіл імперыялізму, — і гаворым аб гэтым у поўны голас, звяртаючы на гэту небяспеку ўвагу народаў усёй зямлі. Нам не патрабуецца ваенная перавага, мы не маем намеру дыктаваць іншым сваю волю. Але зламаць дасягнутую ваенную раўнавагу мы не дазволім. І няхай ні ў каго не застаецца ніякіх сумненняў: мы і ў далейшым будзем клапаціцца аб тым, каб умацоўваць абараназдольнасць нашай краіны, каб у нас было дастаткова сродкаў, з дапамогай якіх можна ахаладзіць гарачыя галовы ваяўнічых авантурыстаў. Гэта ... вельмі істотная перадумова захавання міру».

Адной з важнейшых умоў павышэння нашай гатоўнасці да абароны Радзімы партыя лічыць паляпшэнне ваенна-патрыятычнай работы. З'яўляючыся неад'емнай часткай выхавання мас у духу адданасці ідэалам камунізму, яна заклікана ўсямерна садзейнічаць фарміраванню ў грамадзян краіны, асабліва моладзі, высокіх баявых і маральных якасцей, неабходных для падтрымання надзейнай бяспекі Радзімы.

Задачы далейшага паляпшэння ваенна-патрыятычнага выхавання падпарадкавана і дзейнасць партыйных арганізацый падраздзяленняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Многія з іх, умела ажыццяўляючы кіраўніцтва камсамолам, прафсаюзнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі, палепшылі абаронна-масавую работу, дзейнасць ДТСААФ на факультэтах і ў падраздзяленнях. Дабіваючыся павышэння дзейснасці ваенна-патрыятычнай работы, рэктарат і партыйны камітэт распрацавалі пяцігадовы перспектыўны комплексны план работы па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі. Бюро парткома зацвердзіла план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і святкаванню 40-годдзя вызвалення Савецкай Беларусі і г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Складзены план работы савета ветэранаў універсітэта. Значна ўзрасла актыўнасць удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў партыі і працы ў вучэбнай, вытворчай і грамадскай рабоце. Актыўна ўдзельнічаюць у прапагандысцкіх мерапрыемствах Герой Савецкага Саюза прафесар, доктар гістарычных навук Д. П. Жмуроўскі і дацэнт, кандыдат філасофскіх навук М. Я. Зайцаў, шэраг старшынь секцый ветэранаў на факультэтах і ў падраздзяленнях. Вялікі ўклад у ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі ўносяць І. У. Арэхоўская, Р. І. Ляховіч, В. І. Піменаў, Я. А. Піскуноў, Я. Ф. Плюта, А. М. Рукшын, М. М. Шарый, М. І. Юзэфовіч і многія іншыя.

Але ў правядзенні ваенна-патрыятычнай работы ёсць і недахопы. У ёй, на жаль, удзельнічаюць не ўсе ветэраны. На асобных факультэтах не паладжана належнае ўзаемадзеянне паміж грамадскімі арганізацыямі пры правядзенні мерапрыемстваў, а асобныя з іх часта праводзяцца фармальна, без ўліку інтарэсаў студэнтаў. Разам з тым ленінскі запавет аб неабходнасці ўсебаковага, сістэматычнага абучэння ўсіх грамадзян, асабліва моладзі, ваенным ведам, прывіцця ім высокіх якасцей патрыётаў-інтэрнацыяналістаў набывае ў сучаснай міжнароднай абстаноўцы ўсё большую актуальнасць. Далейшае паляпшэнне ваенна-патрыятычнага выхавання — важная справа ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных, абаронных і іншых грамадскіх арганізацый, усіх секцый ветэранаў.

Быць заўсёды гатовымі да абароны Радзімы — ганаровы абавязак кожнага!

**І. МАРЧАНКА,**
**старшыня савета ветэранаў універсітэта, член парткома.**

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# УРОК ПРА ЎРОК МІНУЛАГА



**АРКАДЗЬ Самойлавіч Львоў спяшаўся. «Ніякай лекцыі я чытаць вам не буду. Проста коратка раскажу». Яму яшчэ абавязкова патрэбна было сустрэцца і пагутарыць са студэнтамі іншых мінскіх ВНУ.**

**У 1945 годзе ў саставе савецкай дэлегацыі ваенны пракурор маёр Львоў быў камандзіраваны ў Нюрнберг у якасці адказнага сакратара. «Мы, удзельнікі гэтага гістарычнага працэсу, імкнёмся да таго, каб праўду даведаліся і запомнілі ўсе пасляваенныя пакаленні».**

Ці лёгка «коратка расказаць», калі размова ідзе аб Міжнародным судзебным працэсе, які працягваўся 11 месяцаў, аб працэсе, які разглядаў злачынствы цэлай фашысцкай дзяржавы супраць усяго чалавецтва, аб судзебным працэсе над 24 галоўнымі нацысцкімі ваеннымі злачынцамі. Для доказу іх віны на суд народаў было пададзена звыш 300 тысяч дакументаў і 56423 абвінаваўчыя акты. За сталом суда сабраліся суддзі чатырох краін: СССР, ЗША, Англіі і Францыі.

Нюрнбергскі працэс пераканаў увесь свет, што ніводнае злачынства агрэсараў не застанецца беспакараным. Нюрнбергскі працэс з міжнароднай трыбуны назваў імёны злачынцаў і іх злачынствы, жорсткасць якіх прымусіла свет зжахнуцца.

Якімі імёнамі назваць гэтых падсудных, «прадстаўнікоў вышэйшай расы», якія адным росчыркам пяра пазбаўлялі жыцця мільёны людзей. Для каго жыццё чалавека нічога не каштавала, а яго цела было толькі сыравінай для вытворчасці мыла і жаночых сумачак. Упрыгожаннем стала каменданта Асвенціма Гесса была чалавечая галава: зморшчаная, памерам з кулак, са слядамі пятлі на шыі. Яна стаяла на падстаўцы з чырвонага дрэва. Тут, у Асвенціме, было знойдзена 7 тон жаночых валасоў, спрасаваных і ўпакаваных у скрыні.

Вайна забрала дзесяткі мільёнаў жыццяў. Фашысты распрацавалі цэлую тэхналогію знішчэння, абсталявалі спецыяльнай апаратурай фабрыкі, электрыфікавалі і механізавалі ўсю вытворчасць знішчэння людзей. І пастаянна ўдасканальвалі яе. Напрыклад, распрацавалі новыя тыпы печаў крэматорыяў і газавых камер...

«Перамога марксізму небяспечна для Захаду. Захад заўсёды глядзеў на Германію як на дамбу супраць бальшавіцкага патоку. Амерыка павінна ўзнавіць гэту дамбу, калі сама хоча жыць», — вось што прадказваў са сваёй адзіночнай камеры былы фашысцкі лідэр Роберт Лей. Лухта? А заява амерыканскага сенатара Тафта аб тым, што «Злучаныя Штаты яшчэ доўга будуць шкадаваць аб прывядзенні ў выкананне Нюрнбергскага прысуду» — зноў лухта?

«Мы, удзельнікі Нюрнбергскага працэсу, людзі, якія бачылі ўсе жахі вайны, пераканаўча і ўсвядомлена імкнёмся данесці праўду аб вайне ўсяму чалавецтву. Адкрыта і прама напамінаем усім агрэсарам: «Панове, не забудзьце нюрнбергскіх урокаў!».

**Запісала А. ЗЯНКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**«Студэнцкая моладзь павінна ведаць гераічнае мінулае краіны. Ведаць і памятаць, якой цаной заваяваны мір, быць гатовай для выканання свайго свяшчэннага абавязку».**





**«У слаўнае свята — Дзень Савецкай Арміі ад усёй душы жадаю чытачам газеты «Беларускі універсітэт» вялікіх поспехаў у вывучэнні гісторыі сваёй гераічнай Айчыны. Няхай кожны з вас будзе палымяным патрыётам, гатовым да подзвігу ў імя сваёй Радзімы».**



Гэта пажаданне нашым чытачам уласны карэспандэнт «Праўды» па Беларусі Іван Рыгоравіч Новікаў напісаў пасля канферэнцыі па яго кнізе «Бесмяротнасць Мінска», якая нядаўна прайшла на гістарычным факультэце.

Фота С. Плыткевіча.

# ПРАРАСЦІЦЬ ЗЯРНЯТЫ ДАБРЫНІ

ЯК ШКАДА, што няма зараз машыны часу. Уключыла б яе: «Пяцідзесятыя гады. Мінск». Прыйшла б на лекцыю крыху раней звычайнага, агледзелася б. А вось і выкладчык. Яго голас гучны, добрая дыкцыя, але ж не гэта галоўнае — цішыня, таму што лектар не пераказвае вучэбныя дапаможнікі і кнігі, а разважае і пабуджае разам з ім думаць і аналізаваць тое, аб чым вучыць палітычная эканомія...

Першы раз у студэнцкую аўдыторыю былога фізіка-матэматычнага факультэта БДУ Іван Трыфанавіч Рагоўскі прыйшоў у 1952 годзе пасля заканчэння Інстытута народнай гаспадаркі, ужо паспеўшы папрацаваць у статыстычным тэхнікуме, закончыць курсы падрыхтоўкі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін пры Ленінградскім універсітэце. Цяпер стаж работы ва універсітэце Івана Трыфанавіча складае 32 гады. Ён — кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Іван Трыфанавіч — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Незвычайна пачалася яго ваенная біяграфія. Яшчэ да заканчэння Рагачоўскай СШ № 1 вырашыў паступіць у Кіеўскае артылерыйскае вучылішча. Але... вайна. І семнаццацігадоваму хлапчуку на другі ж дзень вайны прыйшлося развітвацца з роднымі, блізкімі. А хто тады ведаў, калі яны сустрэнуцца зноў? Добра памятае апошнія словы, сказаныя на развітанне дзедам: «Бывай, дарагі ўнучак, можа больш і не ўбачымся». І на вачах бліснулі слёзы. Як было цяжка знайсці ў сабе сілы, каб не заплакаць. Не так проста было трапіць і ў вагон. Цягнік быў перапоўнены. Але разам з сябрам неяк праз вокны забраліся. Эшалон, які ішоў на Кіеў, абстрэльвала варожая авіяцыя. Так пачалася ваенная біяграфія. Шмат было эпізодаў, якія засталіся ў памяці на ўсё жыццё. І кожны з іх паклаў свой адбітак на загартоўку характару, волі ў такі складаны для ўсіх савецкіх людзей час.

Ну, а самае памятнае? Сціпла і зусім неяк па-простаму расказаў Іван Трыфанавіч пра абарону Масквы, пра першы ўбачаны залп «кацюш», пра вызваленне роднай Беларусі.

...Ля чыгуначнай станцыі Слаўнае Талачынскага раёна 29 чэрвеня 1944 года калона фашыстаў, імкнучыся вырвацца з акружэння, атакавала артылерыйскі дывізіён, які аказаўся без пяхотнага прыкрыцця. Рашуча ўступілі ў паядынак з фашыстамі воіны-артылерысты. Падпусціўшы гітлераўцаў на 200—300 метраў, савецкія воіны павялі агонь. Калі ж ворагам удалося наблізіцца да пазіцый артылерыстаў, І. Т. Рагоўскі падняў салдат у контратаку. Атака ворага была адбіта. Іван Трыфанавіч у гэтым баі быў паранены. Радзіма высока ацаніла подзвіг свайго салдата. Гвардыі лейтэнант І. Т. Рагоўскі быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені...

Зараз Іван Трыфанавіч працуе са студэнтамі. «Юнакі і дзяўчаты, — уголас разважае Іван Трыфановіч, — сапраўдныя кантралёры дарослых. Чым больш патрабуеш ад іх, тым больш аддавай ім сваёй сардэчнай дабрыні». Ён лічыць, што іменна ўласны прыклад выкладчыка дапамагае выхаванню пачуцця адказнасці ў студэнтаў.

У кожным чалавеку ёсць зярнятка адказнасці, адказнасці за свае справы, учынкі. Патрэбна знайсці яго і прарасціць. І Іван Трыфанавіч знаходзіць гэтыя жыватворныя зярняткі ў студэнтаў фізічнага факультэта, з якімі працуе ўжо шмат гадоў. «Я люблю сённяшнюю моладзь, — гаворыць Іван Трыфанавіч. — Яна сапраўды з гонарам нясе эстафету, прынятую ад нашага пакалення, цалкам наследуе энергію, энтузіязм сваіх старэйшых сяброў».

І. Т. Рагоўскі, перажыўшы ўсе жахі вайны, з трывогай гаворыць аб сённяшняй міжнароднай абстаноўцы, аб праве чалавека на жыццё. Ён упэўнены, што мір неабходна ўмацоўваць сваёй самаадданай працай і выдатнай вучобай. Гэта і будзе своеасаблівы ўклад у захаванне міру і бяспекі на нашай зямлі.

**З. АСТАПЮК.**



# РАСТУЦЬ РАДЫ РАЗРАДНІКАЎ



НА ПАСЯДЖЭННІ партыйнага бюро хімфака размяркоўваліся абавязкі сярод яго членаў. Тут і было прапанавана спартыўную, абаронна-масавую работу даручыць дацэнту, кандыдату хімічных навук Мікалаю Георгіевічу Рафальскаму.

Ён пачаў са стварэння калектыву ДТСААФ на факультэце. Сюды выбіраліся супрацоўнікі, студэнты, аспіранты, якія адносіліся да даручанай справы з усёй адказнасцю. Склалі план работы і графік трэніровак, пры гэтым улічваўся вольны час студэнтаў. Такі графік забяспечыў магчымасць большай колькасці жадаючых займацца ў стралковым гуртку. На трэніроўках і занятках займаліся вывучэннем стралковай зброі і тэхнікі бяспекі. І крыху больш увагі заўсёды ўдзялялася навічкам. У іх не адразу ўсё атрымлівалася. Так было і з Андрэем Станчыкам і Сяргеем Каласавым. М. Г. Рафальскі заўсёды з разуменнем адносіўся да іх. І хутка справы пайшлі на лад. А на 2 курсе яны атрымалі трэці спартыўны разрад. Патрэбна адзначыць, што за дзесяць гадоў Мікалай Георгіевіч пад-



рыхтаваў 15 студэнтаў першага, 50 — другога і каля 300 — трэцяга разрадаў. З дапамогай М. Г. Рафальскага на факультэце падрыхтаваны стэнд актывістаў абаронна-масавай работы, а зараз афармляецца стэнд стралковага гуртка.

Нядаўна на універсітэцкіх спаборніцтвах па кулявой стральбе каманда хімфака заняла першае месца, і ёй уручаны дыплом першай ступені, а М. Г. Рафальскі атрымаў Ганаровую грамату.

**Г. МАРОЗАЎ,**
**супрацоўнік універсітэта.**



НА ЗДЫМКАХ: кандыдат у майстры спорту В. А. Махнавет праводзіць заняткі па вывучэнню спартыўна-стралковай зброі са студэнтамі хімфака; спаборніцтвы ў разгары.

Фота аўтара.

# ПАДАРУНАК ПРАЗ ФАРМУЛЯР ?

*Фельетон*

СА ШТОДЗЁННАЙ практыкі дакладна вядома: на падарункі фармуляры не заводзяцца. Ні тымі, хто прэзентуе, ні тымі, каму жадаюць зрабіць прыемнае, адзначыць свята, павіншаваць... Бо, уявіце сабе, якая ж тут прыемнасць, калі адной рукой табе дораць кветкі, а другой іх цану ды колькасць старанна занатоўваюць чорным па беламу... Абсурд! Натуральна — абраза, ніяк не меней.

А чаму гутарка толькі пра кветкі? Што, кнігі, напрыклад, горш? Мусіць, нездарма усюды пішуць: «Кніга — лепшы падарунак». І як тады растлумачыць тое, што на кветкі не заводзяць фармуляры, а на кнігі — калі ласка?!

Прыкладна так павінна абурацца пэўная частка чытачоў універсітэцкай бібліятэкі. Дакладней кажучы — не лепшая яе частка. Зусім дакладна — тыя, хто мае запазычанасці ў бібліятэчным фондзе.

Магчыма, здарылася так: у нейкі момант надзвычайнага свята ўявілася ім, шчаслівым, што кожнаму будзе прыемна прэзентаваць на іх карысць што-небудзь гэткае цікавенькае. Як да гэтага маглі паставіцца супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі — невядома. Але, як казаў паэт, «празрэнні апярэджвалі разлік...» І шчаслівым здалося, што накont падарункаў з бібліятэкі ім, безумоўна, пашанцавала.

Мы бяром кнігу ў рукі не з мэтай прыемна бавіць свой час, а для таго, каб знайсці адказы на хвалюючыя пытанні, лепей і глыбей зразумець навакольны свет і сябе ў гэтым свеце. Кніга—адкрыццё і выяўленне...

Напэўна, так лічыць і Ірына Чарных, якая на сённяшні дзень з'яўляецца своеасаблівай рэкардсменкай сярод студэнтаў фізічнага факультэта, што таксама далучаліся да гэтага, мякка кажучы, занадта доўгага выяўлення. Яе наведання ў бібліятэчную залу на перарэгістрацыю (якая, дарэчы, заканчваецца 1 сакавіка) беспаспяхова чакаюць ужо з 1978 года. Было б няблага, каб яна здолела таксама захапіць з сабой 13 кніг, якія павінна бібліятэцы, а заадно і сваіх сяброў і сяброўак па факультэту Сяргея Шынкевіча, Святлану Скварцову, Яўгенія Луцэнку і іншых, у каго ёсць пэўныя справы да бібліятэкараў.

Так, тайны стварэння мастацкіх твораў, таямніца светабудовы, лабірынты мыслення, нягледзячы на нашу дасведчанасць сярод усяго і вакол таго ж усяго, так пакуль што і застаюцца таямніцамі...

«Дык не век жа таму быць!»— вырашылі студэнты аддзялення філасофіі Любоў Малах і Алег Сяргейчык. «Але ж тут адной хатняй мудрасцю не адбудзеш» — пагадзіліся яны і пайшлі на прыступ граніта навукі праз бібліятэчныя дзверы. І ад той пары грызуць гэты граніт з розных бакоў усякімі навуковымі сродкамі. Шкада толькі, што даводзіцца адрываць іх ад справы, каб нагадаць, што і другія будучыя філосафы даўно тоўпяцца ля бібліятэчнай стойкі, спадзеючыся хаця б на год завалодаць калі не ўсімі таямніцамі свету адразу, дык хаця б «Высновамі філасофіі».

«Без кніг пуста ў чалавечым жыцці. Кніга не толькі наш сябар, але і наш пастаянны, вечны спадарожнік».

Здараецца і так, што гэтыя словы Дзям'яна Беднага некаторыя разумеюць літаральна. Таму, пэўна, і бяруць сабе ў вечныя спадарожнікі кнігі, у тым ліку і з бібліятэчнымі штэмпелямі. Так вырашыў зрабіць і асістэнт кафедры тэарэтычнай механікі М. П. Карэтка. Выбраўшы сабе пяць кніг яшчэ ў 1975 годзе, ён знік у невядомым напрамку, напэўна, карыстаючыся картамі геаграфіі мацерыкоў для VI класа, падручнік з якімі таксама пазычыў у бібліятэцы. Мусіць, некуды далёка заблукаў асістэнт-падарожнік, бо не заходзіць болей у бібліятэку. Не знайшлі яго дома і бібліятэчныя паведамленні, якія запрашалі разлічыцца з бібліятэкай спачатку ў 1980, а потым у 1981 годзе.

Не менш складаны выпадак адбыўся і з асістэнткай кафедры гісторыі БССР Л. Л. Міхайлоўскай. Яе пошукі супрацоўнікі бібліятэкі вядуць ужо 12 гадоў. Тройчы, у 1974, 1980 і 1981 гадах, слалі яны на яе адрас свае цывільныя паперы. Пакуль што ўсё дарэмна.

Тут мае сэнс перайсці ад прыватнага да агульнага. Не патрэбна быць надта дужым у матэматыцы, каб, прыняўшы за канстанту тое, што становішча з даўжнікамі ліхаманіць работу бібліятэкі з году ў год, і, пацікавіўшыся некаторымі лічбамі ў работнікаў аддзелаў, зрабіць наступнае адкрыццё: прыкладна на кожную стошасцідзесятую кнігу ў бібліятэцы існуе свой даўжнік. Калі ўлічыць, што кожны год наведвальнікі бібліятэкі карыстаюцца больш як 1 600 000 кніг, то колькасць «выключаных» з кнігаабароту самых неабходных падручнікаў і першакрыніц, што аселі на паліцах лічаных «шчаслівчыкаў», складае больш за 10 000. Вось гэта падаруначак!

У бясконца доўгім спісе так званых «прэзентаў»—падручнікі і даведнікі, метадычныя рэкамендацыі і высновы, дапаможнікі і практычныя дапаможнікі, курсы лекцый і кароткія курсы тых жа лекцый. Словам, як кажуць у гандлёвых колах, па наменклатурнай колькасці асартыменту універсітэцкая бібліятэка можа даць фору нават аддзелу «Падарункі» вядомага універмага «Беларусь». З той толькі розніцай, што там разлічваюцца за прыдбаную рэч грашыма, а а тут — сумленнем.

Не цяжка ўявіць, што, прачытаўшы гэты фельетон, нейкая колькасць аматараў кніжных гасцінцаў зноў заспяшаецца пратоpанай сцяжынкай да кніжных паліц універсітэцкай бібліятэкі. Хочацца параіць ім, каб не бралі з сабой ні грошай, ні сумлення. За грошы тут нічога не купіш, а сумленне будзе толькі перашкодай. Прыходзьце з пустой, як пусты «дыпламат», душой.

**Віктар ЧАРНЯЎСКІ.**

# ХІМФАК ПРЫМАЕ ГАСЦЕЙ

НЯДАЎНА на хімічным факультэце праводзілася пасяджэнне секцыі універсітэтаў навукова-метадычнага савета па хіміі МінВНУ СССР. У задачу секцыі ўваходзіла абмеркаванне розных аспектаў арганізацыі вучэбнага працэсу і навуковых даследаванняў, іх аналіз, прыняцце рашэнняў, накіраваных на ўдасканаленне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-хімікаў. На пасяджэнні разглядаліся наступныя пытанні: вопыт выкарыстання ЭВМ у вучэбным працэсе ва універсітэтах краіны; выкарыстанне вылічальнай тэхнікі ў вучэбным працэсе на хімічным факультэце БДУ; работа БДУ імя У. І. Леніна па ўдасканаленню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-хімікаў.

На пасяджэнні секцыі прысутнічалі дэлегацыі 15 буйнейшых універсітэтаў краіны. У рабоце секцыі прынялі ўдзел член-карэспандэнт АН СССР, загадчык кафедры МДУ Н. Н. Платэ, член-карэспандэнт АПН СССР, загадчык кафедры МДУ Я. Д. Шчукін, загадчык кафедры МДУ прафесар Ю. А. Пенцін, загадчык кафедры агульнай хіміі МДУ прафесар Я. М. Сакалоўская, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, прарэктар Варонежскага універсітэта прафесар Я. А. Угай, дэканы хімічных факультэтаў МДУ, Горкаўскага, Казанскага, Карагандзінскага універсітэтаў.

БДУ імя У. І. Леніна не выпадкова быў выбраны месцам правядзення пасяджэння секцыі, дзе разглядаліся пытанні спецыялізацыі ў вучэбным працэсе і пытанні выкарыстання ЭВМ. Хімічны факультэт БДУ аператыўна адгукаецца на запыты прамысловасці Беларусі і арганізуе сваю работу па падрыхтоўцы спецыялістаў, зыходзячы з перспектыўнага плана мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў на XI пяцігодку і да 1990 года. Загадам МінВНУ СССР БДУ імя У. І. Леніна вызначаны ў якасці галаўной арганізацыі па распрацоўцы аўтаматызаваных навучальных сістэм на базе ЭВМ, і ў сувязі з гэтым кафедрамі хімічнага факультэта праводзяцца планавыя навукова-даследчыя работы па праблемах вышэйшай школы.

На пасяджэнні секцыі былі заслуханы даклады аб вопыце выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў Маскоўскім, Новасібірскім, Львоўскім і іншых універсітэтах. Вопыту распрацоўкі агульных прынцыпаў выкарыстання аўтаматызаваных навучальных сістэм у БДУ былі прысвечаны даклады прарэктара БДУ прафесара Я. П. Пятраева і дэкана хімічнага факультэта В. Ф. Цікавага, а таксама дацэнта Я. М. Рахманько. Госці азнаёміліся з работай класа ЭВНС-БДУ. У дакладах выступаючых неаднаразова адзначалася, што вопыт работы хімічнага факультэта па распрацоўцы і ўкараненню ў вучэбны працэс аўтаматызаваных навучальных сістэм на базе ЭВМ заслугоўвае распаўсюджання, падкрэслівалася арыгінальнасць распрацаванай у БДУ аўтаматызаванай тэлевізійнай навучальнай сістэмы. У рашэннях секцыі адзначалася неабходнасць хутчэйшага ўкаранення ЭВМ у вучэбны працэс, канкрэтызацыі форм выкарыстання ЭВМ для падрыхтоўкі спецыялістаў-хімікаў.

Падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў садзейнічае арганічнае спалучэнне глыбокай агульнатэарэтычнай падрыхтоўкі з мэтанакіраванай спецыялізацыяй у адной з больш вузкіх галін хіміі. У шэрагу дакладаў разглядаліся прынцыпы, пакладзеныя ў аснову вучэбнай работы па спецыялізацыі студэнтаў. У рашэннях секцыі адзначана эфектыўная работа НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна па падрыхтоўцы спецыялістаў-хімікаў. З гэтай работай удзельнікаў пасяджэння азнаёміў дырэктар НДІ ФХП, член-карэспандэнт АН БССР прафесар В. В. Свірыдаў. Госці факультэта азнаёміліся з навукова-даследчымі лабараторыямі НДІ ФХП і хімічнага факультэта, з формамі ўдзелу навуковых супрацоўнікаў інстытута ў вучэбным працэсе.

У рашэннях секцыі адзначаны станоўчы вопыт хімфака БДУ па падрыхтоўцы спецыялістаў-хімікаў на двух патоках з рознай спецыялізацыяй — педагагічнай і вытворчай, рэкамендавана пашырыць гэты вопыт.

Пасяджэнне секцыі прайшло ў атмасферы творчага абмену вопытам вучэбна-выхаваўчай работы. Абмен вопытам работы дазволіць выкладчыцкаму калектыву факультэта ў сваёй далейшай рабоце ўлічваць дасягненні іншых універсітэтаў у справе падрыхтоўкі спецыялістаў-хімікаў.

**Т. КАРАТАЕВА,**
**дацэнт кафедры неарганічнай хіміі.**

## ДЗЯКУЙ, КАНІКУЛЫ—ДЗЕНЬ ДОБРЫ, СЕМЕСТР!



# «МАГНЕТЫЧНЫ» СНЕГ

...КОЛЫ ПОЕЗДА бесперапынна выбіваюць нейкі адзін і той жа падарожны такт. За акном вагона ўжо даўно засталіся і Мядзведзегорск, і Кандапога, і Петразаводск. Поезд ляціць у ноч. Часам мільгануць агні якой-небудзь станцыі, і зноў уздоўж чыгуначнага палатна толькі цемра і яшчэ, я гэта ведаю, над зямлёй ціха-ціха кружыцца снег. Апошні снег Карэліі...

У мяне верхняя «плацкарта». Нацягнуўшы коўдру да амаль што два тыдні няголенага падбародка, міжволі зноў і зноў услухоўваюся ў такты, што выбіваюць на рэйках колы: «Снег Ка-рэ-ліі... апош-ні, апош-ні...»

А быў і першы. Для ўсіх нас, адзінаццаці, што высадзіліся з маршрутнага аўтобуса пры даволі ёмістых рукзаках і з лыжамі на шашы сярод лесу. Першы ж, хто паспрабаваў збочыць з дарогі без лыж, у той жа момант апынуўся па пояс у палоне ледзяністага малочнага крошыва.

Аўтобус, які прывёз нас, тут жа разварнуўся ў адваротным напрамку, так і не даехаўшы да невялічкай вёсачкі Ліжма, адкуль пачынаўся наш лыжны маршрут — напярэдадні дарогу замяло, і яе яшчэ не паспелі расчысціць. Так што, можна лічыць, паход пачаўся з таго, што пешшу рушылі на зыходны пункт. І яшчэ неаднойчы ў наступныя дні мы пераконваліся, што снег можа быць і для нас, лыжнікаў, не толькі сябрам, але і перашкодай. Той, хто пракладваў лыжню наперадзе атрада, добра ведае гэта.

УСЕ мы трапілі ў гэты край упершыню. І наш камандзір — «бывалы» Віктар Бунта, студэнт-географ, і Алена Матусевіч, будучая журналістка, для якой гэты паход быў турысцкім «дэбютам», і тыя, хто ўжо дастаткова зведаў непераадольнае прыцягненне далёкага арыенціру, што завецца гарызонтам: студэнткі IV курса ФПМ Таццяна Балмакова, Наталля Рудкоўская, Маргарыта Макруш, геафакаўская турысцкая змена — Аляксандр Бяскосты, Пётр Карлоўскі, Васіль Захарчук, выхаванец політэхнічнага інстытута і знаўца турысцкіх песень Ігар Майсяйчук, а таксама іншыя. Іншыя — гэта я з Сяргеем Плыткевічам. Нам дасталіся абавязкі па фотаабслугоўванню паходу.

Але ў той першы дзень на карэльскай зямлі здымаць нам не давялося. І не таму, што не было чаго, а, відаць, цяжкі для пачатку выдаўся дзень. Анежскае возера ў тым месцы, дзе мы меркавалі пракласці па яго лёдзе свой шлях, яшчэ недастаткова падмерзла, таму вырашана было рабіць кругавы абход. Урэшце пад вечар нам яшчэ пашанцавала крыху заблудзіцца. Пішу «пашанцавала», бо гэта была наша, бадай, самая памятная начоўка — першая немаведама дзе, пад маўклівым, бяззорным небам, у палатцы, пастаўленай прама на снезе з насцілам пахучых хваёвых лапак. Перад тым, як класціся ў спальныя мяшкі, доўга гутарылі ля начнога вогнішча пра многае і пра тыя маральныя якасці, якіх патрабуе ад кожнага свайго члена турысцкі калектыў — высокай патрабавальнасці, чуласці, пачуцця ўзаемадапамогі, мужнасці, рашучасці...

НАОГУЛ, акрамя сваіх непасрэдных абавязкаў, многія ў атрадзе мелі (як мы іх называлі паміж сабой) няштатныя «прафесіі». Напрыклад, мадэльер (Васіль Захарчук) або метэаролаг (Аляксандр Бяскосты). Над апошнім з тае прычыны больш за ўсё строілі жартаў — і зразумела, на кожнага з надвор'ем дагадзіць цяжка. Тым больш, што на тры дні наша група трапіла ў завею, якая зацягнулася, зусім недалёка ад Кіжаў, пабываць у якіх было асноўнай мэтай нашага падарожжа.

Двое сутак мы вымушаны былі «пургаваць» у Вялікай Губе, адкуль да гісторыка-архітэктурнага музея-запаведніка Кіжы, размешчанага на адным са шматлікіх астравоў Анежскага возера, было рукой падаць — не больш за 25 кіламетраў. А завіруха не сціхала. Снегам замяло не толькі ўсе дарогі на пад'ездах да пасёлка, але і ўсе вуліцы і завулкі. Часам будаўнічы вагончык, у якім мы бавілі свой час, так хістаўся ад ветру, што няцяжка было ўявіць сябе на палубе якога-небудзь акіянскага карабля. Пагода абяцала сарваць усе нашы планы. Таму «метэаролагу» ў тыя дні неаднойчы амаль што ўсур'ёз прапаноўвалі або перадаць свае паўнамоцтвы другому, каму з надвор'ем, магчыма, больш пашанцуе, або «шаманіць» на пагоду самым добрасумленным чынам. Прызнацца, я слаба разумеў увесь сэнс таго абраду, які выконваў кожным ранкам Саша, выскокваючы з вагончыка на мароз у снег, распрануўшыся да пояса, калі астатнія яшчэ толькі прачыналіся. Але, відаць, «шаманства» прынесла пэўныя вынікі: вецер пачаў сціхаць, а неба час ад часу святлела. Можна было збірацца ў дарогу...



КІЖЫ. Узвышша, на якім размясціўся своеасаблівы драўляны крэмль, адкрылася за пагоркам неяк усё адразу, так што на момант здалося, быццам апынуўся недзе ў далёкім казачным каралеўстве. Але чаму здалося? Ці ж гэта не так? Хіба не па-казачнаму выглядае 22-галовая Прэабражэнская царква? Пабудаваная ў 1714 годзе, яна з 35-метровай вышыні свайго галоўнага купала аглядае наваколныя прасторы. Асноўная частка яе змайстравана без выкарыстання цвікоў з прамаслойнай кондавай сасны.

... «АПОШ-НІ, апош-ні...— снег...»— перастук колаў зноў вяртае да вагоннай рэчаіснасці. Вядома, так, усё ўжо адбылося. Паход скончаны. Цягнік спяшаецца на Ленінград, а далей — на Мінск. І пакрысе рамантычны настрой саступае месца клопатам наступнага дня. І неўпрыкмет аднекуль адтуль, спераду, куды імчыць поезд, наплывае, як кажуць журналісты, пытанне «з начынкай»: а ці варта было імкнуцца сюды, за тысячу кіламетраў, каб пабачыць гэты снег? Бо, акрамя яго, аб усім, што ты бачыў тут, можна прачытаць у звычайных даведніках па той жа геаграфіі або дазнацца з кінапраграм накшталт «Клуба кінападарожнікаў». Што і казаць, слушнае пытанне, а ўсё слушнае, пазбаўленае імгненных пачуццяў і эмоцый, нездарма заўсёды імкнулася кіраваць найбольш адказнымі чалавечымі ўчынкамі. Але пытанне гэта выклікае ў памяці аналогію — другое пытанне, якое калісьці задаваў яшчэ фанвізінскі Недарасль: «Навошта вучыць геаграфію, рамізнікі ўсё роўна ўсюды давязуць?..» Вось так: слушнасць слушнасці — розніца. Бо, кажуць, лепш самому раз пабачыць, чым дзесяць разоў пачуць, і ўжо не ведаю, колькі там разоў прачытаць.

Ды справа, бадай што, і не ў гэтым. Тут нешта другое. Падазронасць на гэтае «нешта другое» адчуваеш ў сабе кожны раз, калі вяртаешся з дарогі дадому. Вяртаешся не адзін...

А магчыма, усё не так складана — проста тут, пад гэтым паўночным небам, як казаў мне аднойчы стары турыст, адметны, незвычайны — «магнетычны» снег. І таго, хто аднойчы адчуў яго пад пружыністымі хрыбцінамі лыж, ён будзе зноў і зноў прыцягваць да сябе, як бы далёка і добра таму ні жылося...

**Ч. ВІКТАРАЎ.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10081. Зак. 331.

23 лютага 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ